**Л. К. Валасюк,** *дацэнт кафедры*
*народна-інструментальнай творчасці*

# СПЕЦЫФІКА САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ-ІНСТРУМЕНТАЛІСТАЎ ЗАВОЧНАЙ ФОРМЫ НАВУЧАННЯ

Навучанне на факультэце музычнага мастацтва прадугледжвае падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў: выкладчыкаў, кіраўнікоў ансамбляў, аркестраў – актыўных дзеячаў музычнага мастацтва. Падрыхтоўка выкладчыка па класе народных інструментаў, кіраўніка ансамбля, аркестра ў галіне народна-інструментальнай творчасці патрабуе прафесійнага валодання спецыяльным інструментам, шырокага мастацка-эстэтычнага кругагляду, высокіх маральна-ідэалагічных якасцей.

Педагог па спецінструменце займае вядучае месца ў ідэалагічным і прафесійным выхаванні студэнта. Асоба выкладчыка-музыканта складваецца ў працэсе вывучэння комплексу спецыяльных, музычна-тэарэтычных і псіхолага-педагагічных дысцыплін. Гэты блок дысцыплін фарміруе ў студэнта асновы тэарэтычных ведаў, практычных навыкаў і ўменняў ігры на інструменце.

Задачай завочнага навучання з’яўляецца падрыхтоўка спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці. Нягледзячы на цяжкасці завочнага навучання, звязаныя з вялікай загружанасцю студэнтаў на асноўнай рабоце, адсутнасцю частых стасункаў з выкладчыкамі вуза (усяго на працягу аднаго месяца ў навучальным годзе), патрабаванні да студэнтаў завочнага навучання прад’яўляюцца такія ж высокія, як і да студэнтаў дзённага навучання.

Паспяховасць выканання студэнтам вучэбнага плана залежыць у значнай ступені ад умення арганізаваць і рацыянальна размеркаваць свой час для работы па спецыяльнасці і вучэбных заняткаў у міжсесійны перыяд.

Выхаванне навыкаў самастойнай творчай работы ў дачыненні да студэнтаў-інструменталістаў факультэта музычнага мастацтва, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, можна разглядаць як працяг працы, якая пачалася з першых крокаў навучання ігры на інструменце (у 7–10 гадоў), як пераемнасць у навучанні: дзіцячая музычная школа – музычны каледж – універсітэт. Вырашэнне гэтай актуальнай праблемы магчыма толькі пры індывідуальным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падыходзе да кожнага студэнта і стварэнні адпаведных умоў для самастойных заняткаў. Стартавы пачатак навучання ў студэнтаў універсітэта вельмі розны, асабліва на завочным аддзяленні, улічваючы ўзроставыя асаблівасці студэнтаў, базавыя веды, практычныя навыкі і ўменні, атрыманыя за 10 гадоў (і болей) навучання ігры на інструменце.

Пэўная частка студэнтаў-завочнікаў вучыцца на платнай аснове. Практыка паказвае, што тыя студэнты, якія пры паступленні маюць па спецінструменце нізкія адзнакі (4, 5) па вывучанай з выкладчыкам каледжа праграме, у асноўным не могуць самастойна вучыць праграму ў ВНУ, не ведаюць, як займацца, маюць дрэнныя вынікі, і часцей за ўсё іх адлічваюць. Думаецца, мэтазгодна прымаць на платную форму навучання абітурыентаў, якія маюць па спецінструменце не менш за 6 балаў на ўступных іспытах.

Адной з найважнейшых умоў аптымізацыі і інтэнсіфікацыі вучэбнага працэсу ў ВНУ з'яўляецца арганічнае спалучэнне і ўзаемасувязь індывідуальных і самастойных заняткаў студэнтаў. Самастойныя заняткі павінны мець канкрэтны змест. Студэнты павінны мець навыкі самастойнай работы над мастацкімі творамі:

– аналізу стылістычных асаблівасцей канкрэтнага твора, выяўлення характэрных асаблівасцей творчасці кампазітара;

– вывучэння варыянтаў магчымых інтэрпрэтацый твора (азнаямленне са спецыяльнай літаратурай, аналіз нотных рэдакцый, выкарыстанне фондаў фона- і відэатэк);

– асэнсавання музычных вобразаў і пошуку мастацка-выканальніцкіх сродкаў іх увасаблення.

Індывідуальныя заняткі з'яўляюцца складнікам вучэбнага працэсу і маюць вялікае значэнне ў фарміраванні музыканта: 1) аўдыторныя заняткі з выкладчыкам; 2) самастойны працэс засваення тых заданняў, якія вызначаны выкладчыкам і прызначаны для наступнай праверкі ў класе. Калі індывідуальныя заняткі існуюць як традыцыйная форма навучання, то самастойная работа мае шэраг арганізацыйна-метадычных цяжкасцей. Галоўную задачу вышэйшай навучальнай установы – навучыць вучыцца – неабходна рэалізоўваць абдумана і мэтанакіравана, садзейнічаць праяўленню творчага пачатку, патрэбнасці ў самаарганізацыі і самадысцыпліне. На аўдыторных занятках самастойная работа студэнтаў прадугледжвае развіццё творчых здольнасцей і актыўнай разумовай дзейнасці. Асноўная задача педагога – сфарміраваць музыканта, які ўмее самастойна набываць веды. Кожнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пастаўленае педагогам заданне павінна быць дакладным і ясным, адпавядаць магчымасцям студэнта і дапамагчы яму набыць нейкія новыя якасці. Справа педагога – забяспечыць навучэнца не толькі ведамі, але і метадамі работы па засваенні, паказаць найбольш простыя і кароткія шляхі працы над музычным творам у цэлым, навучыць творча працаваць. Вельмі важна студэнту-завочніку штодзённа ўдасканальваць тэхніку выканання, арганізаваўшы штодзённыя самастойныя заняткі на спецінструменце. Тут педагог можа дапамагчы студэнту ў складанні прыкладнага плана самастойных заняткаў, у чарнавой прапрацоўцы дамашняга задання ў класе, дапамагчы ў разборы новых твораў, чытанні нот з ліста і г. д.

Студэнтам-інструменталістам для самастойнай работы вельмі важна выпрацаваць звычку да штодзённай ігры на інструменце, развучвання твора ў павольным тэмпе (на першым этапе), прапрацоўкі цяжкіх месцаў. Вельмі важна ўмець самастойна праставіць аплікатуру, улічваючы сувязь аплікатуры са структурай мелодыі, штрыхамі, залежнасць аплікатуры ад характару гуку, дынамікі, артыкуляцыі, фразіроўкі, тэмпу, прадугледжваць розныя аплікатурныя варыянты, варыянты змены пазіцый, уменне працаваць над гукам, фразіроўкай, дынамікай і г. д.

Для студэнта-інструменталіста істотным з’яўляецца разуменне правільнай арганізацыі ўсіх бакоў музычнага творчага працэсу, пачынаючы ад задумы да канкрэтнага ўвасаблення. Таму мысленне студэнта-музыканта неабходна сканцэнтраваць галоўным чынам на наступных аспектах дзейнасці:

1. Стварэнне вобразнага строю твора – магчымых асацыяцый, настрою і думак, якія яны выклікаюць.
2. Абдумванне матэрыяльнай тканіны твора – логікі развіцця думкі ў гарманічнай будове, асаблівасцях мелодыі, рытму, фактуры, дынамікі, агогікі, формаўтварэння.
3. Пошук найбольш эфектыўных шляхоў, спосабаў і сродкаў увасаблення на інструменце думак і пачуццяў. «Я дасягнуў таго, чаго хацеў», – вось сцвярджальная кропка, кажучы словамі Г. Г. Нейгауза, у працэсе выканання музыкі.

Пашырэнне музычнага і агульнага інтэлектуальнага кругагляду павінна быць пастаянным клопатам як выкладчыка, так і студэнта-музыканта. Музычны твор у рэальным гучанні існуе ў незлічонай колькасці разнастайных выканальніцкіх трактовак. Стымуляванне педагогам варыятыўнага падыходу да выконваемага твору,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пабудовы некалькіх выканальніцкіх планаў аднаго і таго ж твора вядзе да фарміравання ў студэнта багатага творчага ўяўлення, павышае мастацкую выразнасць ігры.

Менавіта спецыфіка патрабуе пэўнага ўзроўню самастойнасці пры інтэрпрэтацыі музычных твораў, паслядоўнасці і сістэматычнасці ў рабоце, этапнасці ў засваенні музычнай формы твора. Прапаноўваючы заданні для самастойнай работы практычна па ўсіх дысцыплінах музычных спецыялізацый ніколі немагчыма рэгламентаваць дзейнасць студэнта і прадугледзець у поўнай меры канчатковы вынік, таму што ў любым выпадку гэта дзейнасць будзе характарызавацца як творчая і ў выбары сродкаў, і ў выбары метадаў яе рэалізацыі.

Для актывізацыі самастойнай творчай дзейнасці на кафедры існуюць цікавыя, на наш погляд, формы работы: міжсесійны кантроль (студэнты самастойна, без дапамогі выкладчыка рыхтуюць праграму з двух твораў; на I курсе – два эцюды, на II–IV курсах – акадэмічны канцэрт, які яны паказваюць у час сесіі ў прысутнасці групы і выкладчыкаў, – такая форма здачы самастойнай работы носіць адкрыты характар, з паслядоўным абмеркаваннем усіх выступленняў студэнтаў), справаздачныя канцэрты класаў, кафедраў, удзел студэнтаў-завочнікаў у фестывальным і канцэртным жыцці за межамі ўніверсітэта. Для студэнтаў I курса ФЗН прадметна-метадычная камісія па спецінструменце (струннікі) у маі месяцы рыхтуе канцэрт студэнтаў-інструменталістаў дзённага аддзялення. Аднак нельга не звярнуць увагу на існуючыя праблемы:

1. Якасць падрыхтоўкі студэнтаў-інструменталістаў завочнай формы навучання ў сувязі са скарачэннем працягласці сесій і індывідуальных гадзін па спецдысцыплінах (на I курсе – па 4 гадзіны ў семестр, на II–III – па 6 гадзін) і падаўжэннем тэрміну навучання ва ўніверсітэце да 6 гадоў.

2. Актывізацыя самастойнай пазнавальнай дзейнасці студэнтаў па дысцыплінах кафедры і кантролю выкладчыкаў за яе якасцю.

3. Праблема забеспячэння аўдыторным фондам і музычным інструментарыем для самастойных заняткаў студэнтаў.

4. Праблема забеспячэння тэарэтычнай літаратурай, нотнымі выданнямі, грамзапісамі, відэаматэрыяламі па спецдысцыплінах: спецінструмент, дырыжыраванне, фартэпіяна і інш.

Такім чынам, самастойная работа – вядучая, актывізуючая пазнавальная форма навучання, грунт, на якім будуецца ўся сістэма

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фарміравання асобы высокакваліфікаванага спецыяліста ў галіне культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ